Методический фест
“Реализация целей стратегии устойчивого развития при организации образовательного процесса в учреждениях образования”

# СЦЭНАРЫЙ ЛІТАРАТУРНАЙ ВЕЧАРЫНЫ, ПРЫСВЕЧАНАЙ ТВОРЧАСЦІ НІНЫ МАЦЯШ

Аўтар:
**Тарасенка Вольга Феліксаўна,**
Настаўніца беларускай мовы і літаратуры
дзяржаўнай установы адукацыі
“Сярэдняя школа № 18
г. Магілёва”

Магілёў, 2024



**Сцэнарый літаратурнай вечарыны, прысвечанай**

**творчасці Ніны Мацяш**

**“Паміж усмешкай і слязой…”**

**Мэта:** пазнаёміць вучняў з творчасцю беларускай паэткі Ніны Мацяш. Вучыць разумець змест вершаў, падтрымліваць цікавасць і жаданне расказваць вершы на роднай мове. Далучаць дзяцей да мастацкай спадчыны беларускага народа. Выхоўваць любоў і павагу да беларускага слова.

**Ход мерапрыемства**

**Вядучы**. Што чакае за крутой гарой-
Выявіцца толькі на вяршыні.
Птушка лёсу ўсё кругі вяршыла

З паднябесся да зямлі сырой…

Гэта радкі з паэмы “Жніва” Ніны Мацяш. Смерць маці. Невымерная, балючая страта для кожнага з нас сталася, аднак, і нараджэннем балючай, прасякнутай любоўю споведзі, а магчыма, і даччыным выратаваннем. Боль, адчай перапляліся ў вечныя, але для кожнага з нас свае пытанні: “Хто я? Дзеля чаго я на гэтай зямлі? З чым прыйшоў і куды пайду?” 19 снежня Ніны Мацяш не стала. 65 гадоў зямнога шляху. З іх больш за чатыры стагоддзі – літаратурнага.

На экране – слайды. Хата, у якой нарадзілася паэтка





Разам з бацькамі. Сярэдзіна 1960-х



**1-шы чытальнік**.

Трапечаш між людзьмі –
Ліст у лістве густой.
Расіначку садзьмі –
І ліст ужо не той…
І ўжо інакшы свет,
Інакшы ў часу твар.
Пакуль ты у лістве,
І ты –
яна, ліства.
У слотнае радні
І ўсмех свой, і правы.
..Чуць, як лістком адным

Балюча
куст жывы…

**Вядучы**. Вечныя пытанні паўсталі перад дзяўчынай-паляшучкай з вёскі Нівы на Бярозаўшчыне ўжо з ранніх вершаў, народжаных першай уласнай на ўсё астатняе жыццё драмай – невылечнай хваробай. Як гром сярод яснага неба абрынулася яна на студэнтку інстытута замежных моў, абмежавала вялікі свет чатырма сценамі бацькоўскай хаты, пісьмовым сталом і рэдкімі, з дапамогай сваякоў і сяброў, літаратурнымі ды санаторнымі вандроўкамі. Колькі ж трэба мець мужнасці, каб свой першы паэтычны зборнік “Агонь” распачаць такімі радкамі.

**2–гі чытальнік**.

Не рабіце мне скідак.
Ніколі. Ні ў чым…
Не рабіце,
Калі не жадаеце скрыўдзіць,
…Прыбівае да водмелі
На няпэўны спачын
Аслабелыя
Сонцам прашытыя крыгі.
Але ў пашчу бурлівую зноў рашуча штурхне
Іх
Крутое плячо
Акрыянага берага!
Не рабіце мне скідак,
Паверце ў мяне,
Як рака
У вясну гэту шчыра паверыла.

**Вядучы.** Колькі мужнасці і цярпення было ў апантанай творчасцю дзяўчыны трымаць сябе ў форме, пастаянна змагацца з цяжкай хваробай (большую частку свайго жыцця яна была прыкавана да інваліднага крэсла). Пасля поўнасцю перасталі слухацца ногі, аслаблі і рукі. Цяжка стала нават трымаць аловак, ручку. Але, нягледзячы на гэта, Ніна Мацяш супрацоўнічала з бібліятэкамі раёна, удзельнічала ў арганізацыі і правядзенні шматлікіх літаратурных вечарын. Агеньчык душы Ніны Мацяш сілкаваўся вялікай любоўю яе сэрца да бацькоў, да роднай Беларусі, да любага Белаазёрска, да клапатлівай радні і вялікай колькасці сяброў.



З сябрамі па пяру падчас пісьменніцкага з’езда (злева направа: Ніна Мацяш, Янка Брыль, Сяргей Законнікаў, Ніл Гілевіч)




Падчас апошняй сустрэчы з чытачамі Белаазёрска 17 снежня 2008г. (Злева направа: Васіль Жуковіч, Ніна Мацяш, Міхась Скобла)

**Верш “Белаазёрск” чытае Ніна Мацяш. Гучыць запіс.**

Ці бачыў ты хоць раз Белаазёрск,
Калі на дахі мякка ноч
прысядзе, павее казкай ад старых азёр
І пойдуць песні поруч па абсадзе?
Тады глядзіш на родны, любы кут
І цэлы свет гатоў у сведкі клікаць:
Ці столькі зор насыпалася тут
На дол з каўша Мядзведзіцы Вялікай,
Ці гэта ў небе, бы ў люстэрку тым,
Адбітак зыркі ўсіх агнёў Палесся?..
Белаазёрск мой, сон мой залаты,
Мая
   яшчэ не складзеная
- песня!

**Вядучы.**Асноўным рэфрэнам праз усю творчасць Ніны Мацяш праходзіў матыў любові да бацькоў, да матулі, светлы вобраз якой на працягу ўсяго жыцця атуляў паэтку ад нягод, наталяў душу высокім пачуццём павагі і пашаны, натхняў да творчасці. Балюча перажывала Ніна Язэпаўна адыход маці ў іншы свет. Вынікам тых душэўных пакут і стала “Паэма жніва”. Менавіта за гэты твор паэтка была ўдастоена высокай узнагароды – Літаратурнай прэміі імя Аркадзя Куляшова за лепшы твор у галіне паэзіі.

Акрамя таго, Ніна Мацяш самастойна авалодвала замежнымі мовамі. У арыгінале чытала французскіх, польскіх, нямецкіх, балгарскіх, украінскіх класікаў літаратуры. Многіяіхтворыперакладала на роднуюмову.

**3-ці чытальнік.**

Франсуа Марыяк “Цень”

У дні, калі упал  спыняў усё жыццё,
Калі жарліва сонца на знямоглых нівах
Да сэрца вінаграднік прыгортвала маўклівы,
У час, калі шых ты знясіленых касцоў
Гнялі траву крыжамі целаў нерухлівых,
Адным-адзін у тыя дні пякелля, пылу,
Наўпрост прад сном зямлі прыгнечана-панылым,
Аглушаны цыкадаў незлічоных цвыркаценнем,
Я прагнуў сэрца вашага, як прагнуў ценю.

**4-ты чытальнік.**
Смарагд
Зноў цёплага святла вярнулася пара.
Нарэшце ўладны я над схмаранай душой.
Павесялее ў пальцах вашых і смарагд,
Хоць нежывым яго ўважалі мы зімой.
Больш не люструе ён таемнаю вадой
Спануры позіркаў, якой пазбыўся я.
І бачысся ты мне сярод пакуты ўсёй,
О, горкая любоў апошняя мая,
Пяшчотнаю, як ноч, адно пяшчотай той.

**Вядучы.** Яе талент быў living рознабаковы. Ніна Мацяш праявіла сябе і ў выяўленчым мастацтве. Толькі «фарбы» для стварэння карцін яна выбрала незвычайныя – птушыныя пёркі. Праца з імі прывяла да стварэння новага віду мастацтва, які і назвы яшчэ не меў. Пазней яго пачалі называць пёркаграфіяй. І такіх работ у Ніны Язэпаўны за сотню.

**Дэманструюцца слайды. Падчас дэманстрацыі слайдаў гучаць словы Ніны Мацяш:** “Калі чалавеку творчаму выпадае доўгі час быць засяроджаным на ўласных думках, на ўласных перажываннях. Жыць як бы ўнутры самога сябе, тады, бывае, адкрываюцца яму нейкія іншыя грані, патаемныя грані і сэнсы быцця. Зямное жыццё, пры ўсім драматызме яго, пры ўсіх пакутах, яно, усё ж такі, не ёсць карай Божай, ёсць дарункам Божым”.









**Вядучы**. Была ў паэтэсы яшчэ адна грань таленту: яна стварала музыку да сваіх твораў. Казала, што проста душа напявае мелодыю  верша, а сама яна нават нотнай граматы не ведае. Ніна Мацяш сама паклала на музыку «Усмешку», «Калядную», «Песню ў цярноўніку», «Забялела ночка».

15 гадоў таму (19снежнія 2008 года) пайшла ад нас Ніна Язэпаўна, але сёння і надалей яе паэзія будзе дапамагаць нам жыць годна і прыгожа. Душа паэткі, як і яе лірыка, – з любові і агню, і вельмі прыемна, што моладзі падабаецца яе паэтычнае слова, якое так прыгожа кладзецца на музыку.

**Гучыць песня М. Марозава, Н. Мацяш “Воран кружыць” у выкананні В. Равенькі**

**ВОРАН КРУЖЫЦЬ**

*Я шукала чараўніцу,*
*Ах, шукала,*
*Каб мяне ад варання*
*Паратавала,*
*Каб яно штодня-штоночы*
*Не кружыла,*

*Каб я цяжка так па сонцу*
*Не тужыла.*
*Абышла я паўкраіны,*
*Паўзямліцы*
*,Не знайшла нідзе жаданай*
*Чараўніцы,*
*Бо яны, бо і яны*
*Па сонцу тужаць,*
*Бо над кожнаю душой*
*Свой воран кружыць...*
1989



